# СВЯТОЧНЫЯ ВЫСТАЎКІ

У бібліятэках Мінска адкрыліся літаратурныя выстаўкі, прысвечаныя міжнароднаму святу працоўных—1 Мая.

Багатымі матэрыяламі насычана выстаўка ў Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна. Тут прадстаўлены раздзелы: «Класікі марксізма-ленінізма аб 1 Маі», «1 Мая — свята сацыялістычнай працы» і іншыя.

Вялікую цікавасць прадстаўляе зборнік дакументаў «1 Мая ў царскай Расіі». У ім змешчаны пракламацыі і лістоўкі цэнтральных і мясцовых арганізацый бальшэвіцкай партыі, якія распаўсюджваліся ў дні першамайскіх свят сярод рабочых фабрык і заводаў.

Святочныя літаратурныя выстаўкі адкрыліся таксама ў бібліятэках імя Горкага, імя Пушкіна, дзіцячай бібліятэцы, у Акруговым Доме афіцэраў і ў Доме партыйнай асветы.